**Сценарий воспитательного мероприятия.**
**Легенды Мінска**

Разработчик: Человенко Наталья
Николаевна, заведующий отделом
культурно-досуговой деятельности
УДОДиМ “Контакт”

*Гучыць народная беларуская мелодыя. Пляцоўка нагадвае гасцёўню ў хаце ці стылізаваны падворак (лаўкі, гладышкі і чыгункі, развешаныя ручнікі і г.д.).*

*Гаспрадыня – цетка Ганна завіхаееца на пляцоўцы двара. Да яе заходзіць гурт дзяцей малодшага ўзросту.*

*Выкарыстоўваецца кампутарнае і музычнае абсталяванне.*

**Дзеці:** Добры зень, цётка Ганна!

**Цётка:** Добры дзень, мае даражэнькія! Можа прыйшлі аладкамі пачаставацца, ды яблык маіх духмяных паесці?

**1-ая дзяўчынка:** Цётачка Ганна, мы прыйшлі да вас за дапамогай.

**1- шы хлапчук:** Нам далі заданне даведацца нешта цікавае і мала вядомае пра наш родны горад

**Цётка**: Ну, дык хутчэй расказвайце, што за заданне такое...

*Дзеці (наперабой) пачынаюць расказвац, аб тым, што ім трэба падрыхтаваць легенды, паданні пра наш горад.*

**Цётка:** Цішэй, цішэй, давайце ўсё папрарадку. Давай, Аленка, расказвай.

**2-гая дзяўчынка**: Цётачка, ведаеце, нам трэба разгадаць месцы нашага горада згодна легендам, а мы іх не ведаем. Ці не дапаможаш нам?

**Цётка:** Чаму ж не, але толькі адна ўмова: вы мне самі будзеце дапамагаць, усё слухаць і адгадваць.

**Дзеці:** Абавязкова.

**Цётка:** (*гучыць спакойная старадаўняя музыка*).

Мінск, як і кожны горад шмат чаго пабачыў на
сваім вяку: шчаслівыя і сумныя, рамантычныя і трагічныя падзеі пакінулі свій след у
гісторыі. Нешта адыйшло ў нябыт, а нешта стала гарадской легендай.
Праўда ці выдумка ўтоены ў іх – мы ніколі не пазнаем, але ў легенды,
паданні хочацца верыць, таму што без іх горад пераўтвараецца ў нудны набор
бетонных скрынак. Ёсць у Мінска і свае прывіды, і свае легенды ды паданні. Вось пра некаторыя мы вам і раскажам і пакажам іх. Але называць імёны некаторых дзеючых асоб мы не будзем, таму што вы ўсе павінны будзеце разгадаць самі. А цяпер увага, першая легенда-пытанне.

*На экране дэманструюцца слайды.*

Легенда 1.“Жаніцьба Свіслачы і Менеска”.

На дне рэчкі жыў Вадзяны і была ў яго дачка-прыгажуня. Дзякуючы сваёй незямной прыгажосці, дзяўчына карысталася поспехам сярод шматлікіх прыхільнікаў. Многія, у тым ліку Пярун і Жыжаль, спрабавалі яе сасватаць у бацькі, але прыгажуня заставалася непрыступнай. Калі ж прыйшоў час аддаваць дачку замуж, Вадзяны прапанаваў дачцэ выбраць выбранніка. Каб выбраць лепшага, маладая дзяўчаты прыдумвала розныя выпрабаванні для жаніхоў. У адным з іх прапанавала пакаштаваць вясельны пірог з камення. Паколькі нікому не ўдалося гэта зрабіць, дачка Вадзянога доўгі час заставалася адзінокай. Пасля таго, як усе жаніхі былі распуджаны, прыгажуня знервавалася і загаравала. Пастаянныя насмешкі над жадаючымі ўзяць яе ў жонкі прывялі да таго, што больш такіх не засталося сярод боскіх стварэнняў. Тады Вадзяны прапанаваў дачцэ звярнуць увагу і паспрабаваць знайсці выбранніка сярод людзей. Калі ёй хтосьці спадабаецца, на гэтым месцы паабяцаў стварыць вялікі горад. Выбар дзяўчыны ўпаў на смелага, мужнага і багатага князя. Прыгажуня была здзіўлена знаходлівасцю малайца, які знайшоў спосаб прайсці выпрабаванне непакорлівай дзяўчыны – пабудаваў вадзяны млын і перамалоў каменны вясельны пірог. Так дачка Вадзянога знайшла свайго каханага, а на гэтым месцы ўзнік горад-крэпасць, які атрымаў назву ў гонар князя.

**Цётка:** А цяпер пытанне: “Як звалі дачку Вадзянога і князя? (*Адказ – дачка Вадзянога Свіслач, князь Менеск)*

**3-я дзяўчынка***:* Ой, цётка *Ганна*, дзякуй за цудоўную легенду.

**1-шы хлапчук:** А я чуў, што і пра гэта месца, дзе мы зараз знаходзімся, ёсць цікавая , ці то казка, ці гісторыя, можа раскажыце?

**Цётка:** А пра што, пра прывід Ратушы, ці пра нешта іншае?

**Дзеці:** А вы нам раскажыце, а мы паспрабуем адгадаць.

Легенда 2. Пра герб горада.

**Дзяўчына( летапісец):** Доўга думалі гараджане, як гэту выяву зрабіць. І вырашылі яны запрасіць на плошчу мінскіх прыгажунь. Тыя павінны былі дакрануцца да шчыта, і выява, якая з’явіцца, павінна была стаць важным знакам для нашага горада. Падыходзілі прыгажуні і дакраналіся, але нічога не з’яўлялася. І толькі пасля таго, як наблізілася самая прыгожая дзяўчына, з’явілася выява Божай маці і 6 анелаў. Так, у 1591 годзе ў Мінску з’явіўся свій… што? Адкажыце на пытанне.

**Дзеці:** *Ведаем, гэта ж герб наша горада.*

**1-шая дяўчынка:** Цётка Ганна, а мне бабуля расказвала пра нейкую гару ў нашым горадзе, пра цмока і прыгажуню. Ведаеце пра гэта? (*звяртаецца да дзяцей, ці гледачоў.)(адказ).*

**1-я дзяўчынка**: А вы, цётка Ганна?

**Цётка:** Ведаю, таксама ад сваёй бабулі і зараза вам паведаю, а вы разгадаеце месца і назву гэтай гары.

Легенда 3. Прыгажуня і пачвара.

Былая Высокая гара, дзе цяпер размешчана плошча, а як называецца плошча, вы павіны будзеце адказаць пасля расповеду. Даўным–даўно звалася яна Змеевай. Па паданні, у яе пячоры жыў некалі крыважэрны змей.

Можна нават сказаць, цмок, якіх тады было нямала ва ўсёй Еўропе. Цмок, як гэта вядзецца, ліхадзейнічаў. Патрабаваў даніну, розныя яствы, выкрадаў людзей. А раз на год абавязваў навакольныя паселішчы прапануюць яму дзесяць прыгожых дзяўчын, якія павіны былі ісці на смерць. І вось аднойчы, цмок памыліўся – жэрабя ўпала на дзяўчыну, нарачоным якой быў вядомы мясцовы волат. Яму вельмі не спадабалася, што яго нявеста трапіць да змея, і ён адправіўся да цмока, каб расквітацца з ім. Адбылася жорсткая ды крававая бітва.

Легенда мае два варыянты развязкі. Адзін з іх – самы сапраўдны хэпі-энд. Волат перамагае супастата, забірае, сваю нарачоную, і жывуць яны доўга і шчасліва. Другі варыянт трагічны. У бітве са змеем волат выйграў, але сам быў смяротна паранены. Крыштальную труну з целам малайца апусцілі на дно ракі Свіслач, акурат у тое месца, дзе пад вадой схаваўся забіты змей. Паданне расказвае, што яшчэ многія дзесяцігоддзі, калі ўзровень вады ў рацэ апускаўся, над вадой былі бачны велізарныя рэбры забітай пачвары.

**Цётка:** Ну, што мае даражэнькія, можа адказаць, што гэта за гара і дзе яна знаходзіцца? Як называецца гэта месца сёння?

**Дзеці:** (*адказ*) Дык гэта Юбілейная плошча, побач з кінатэатрам “Беларусь”.

**Цётка:** Малайцы, правільны адказ**.** Ну што, сябры мае, цікавыя легенды пра наш горад? (*Адказ*). А іх ёсць яшчэ шмат. Хочаце яшчэ адну паслухаць?

**1-я дзяўчынка:** Цётачка, ну яшчэ адну, калі ласка.

**Цётка:** Ну, тады слухайце.

Легенда 4. Кальварыйскі прывід.

Некалі, прыкладна ў канцы 19 стагоддзя, памерла позняй восенню маладая паненка. Вырашылі пахаваць яе на мінскіх могілках. Паклалі ў труну, адпелі, замуравалі ў склепе. Але аказалася, што паненка не памерла, а заснула летаргічным сном. Прачнуўшыся, дзяўчына так і не змагла выбрацца з забітай труны і ў пакутах загінула. З таго часу яе прывід у пазнейшыя лістападаўскія ночы на працягу стагоддзя блукаў па могілках. Прывід знік толькі пасля таго, як вандалы разбурылі склеп. Хоць да гэтага часу некаторыя паўночнікі, якія шпацыравалі каля могілак, сцвярджаюць, што бачылі дзіўную белую постаць,

якая блукала паміж магіламі. А што гэта за могілкі? Адкажыце, дзе яны ў нашым горадзе? (

**Дзеці** : (а*дказ)* – “Кальварыйскія могілкі”.

**Цётка:** Вось і малайцы, а зараз праную вам яшчэ адну легенду, слухайце і адгадвайце.

Легенда 5.

**Цётка:** Неяк на дзядзінцы Мікалаеўскага храма, нічога не рабіў юродзівы Федзька Камар, які звычайна харчаваўся міластыней гараджан. Ён стаў сведкам таго, як нейкі чалавек раптоўна памёр на дарозе да храму. У руках у яго быў цяжкі брудны мех. На тым месцы, дзе стаяў Мікалаеўскі сабор, у старажытнасці знаходзілася могілкі. Казалі, што на ім быў пахаваны з усімі сваімі скарбамі хвацкі разбойнік Сенька Сокал - лепшы з дружыннікаў князя Глеба Усяславіча.

Юродзівы, схапіўшы мяшок, пабег у бліжэйшы лес, далей ад людскіх вачэй. На дне мяшка павабна блішчала золата, якое было падобна на тое, якім валодаў Сенька. Аднак, ахоплены страхам і прагнасцю, Федзька Камар не заўважыў, як трапіў у балота. А яно паглынула прагнага юродзівага і яго скарбы. З тых часоў гэтае месца і сталі называць… як? Зараз вы мне адкажыце.

**Дзеці:** Дык гэта ж Камароўка.

**Цётка:** Правільна, малайцы! Па іншай версіі назва пайшла ад велізарнай колькасці камароў, якія у багацці некалі лёталі над гэтай балоцістай і лясной мясцовасцю. Спачатку так называлі толькі вёску размешчаную тут, а пазней - і ўсю мясцовасць.

Вось вы і пазнаёміліся з некаторымі паданнямі, ды легендамі нашага горада. Шмат у мяне ёсць яшчэ цікавага пра наш горад. Але гэта будзе ўжо ў іншы раз. Шануйце свой горад, прыгожы і сэрцу мілы. Шукайце вядомае ў невядомым. Адкрывайце яго новыя таямніцы!